КУЛЬТПЛЯЦОЎКА

# Як калядоўшчыкі па Пінску прайшліся



**У мінулыя выхадныя па вуліцы Леніна крочыла каляднае шэсце з традыцыйнымі персанажамі: Казой, Мядзведзем і каляднікамі, якія неслі зорку і спявалі пад гармонік песні.**

Народнае гулянне «Ой, прайшлі калядкі…» сабрала калектывы дамоў культуры Піншчыны, якія дэманстравалі свае мясцовыя абрады ў «Калядным батле». Гэтае мерапрыемства стала ўжо традыцыйным і збірае шмат зацікаўленых гараджан. Цяпер сапраўдных калядоўшчыкаў не часта ўбачыш, хіба толькі дзеці з зоркай прыйдуць паспяваць.

Увогуле, у Шчадрэц адбываецца бадай адно з самых вясёлых народных гулянняў, якія яшчэ захаваліся ў беларускіх вёсках.

Немагчыма ўявіць шчадруючую працэсію без Казы і Мядзведзя. Вось і госці з раёна прывезлі гэтых персанажаў. На галоўнай плошчы горада разгарнулася сапраўднае свята: пасярод сцэны шчодры стол з пачастункамі, дзве гаспадыні ладна шчабечуць, і да іх завітваюць каляднікі.

Па звычаю каляднікі падыходзяць да дому ці да якой кампаніі на вуліцы і гучна пяюць: «Добры вечар! Шчодры вечар!» А потым пярэстая працэсія пачынае выпрошваць у гаспадароў гасцінцы, жалячыся, што яны ішлі з такіх даляў, што ажно ў Казы ногі забалелі. І ёй патрэбна падсілкавацца! А тут і Мядзведзь пачынае колы круціць, зарабляючы сабе на пачастункі. Адыходзяць каляднікі да другой хаты толькі пасля таго, як праспяваюць песні і атрымаюць падарункі.

Скупіцца на пачастункі было нядоб справай. Існуе павер'е, што чым шчад адарыць калядоўшчыкаў, тым больш у лым для гаспадароў будзе год.

Прайшліся калядкі па Пінску, прыне весялосць на ўвесь 2020 год!

Ірына ДЗЕНІСОВ
Фота аўта



